# ПАМЯЦЬ ЯК АСНОВА ЛІРЫКА-ФІЛАСОФСКІХ РАЗВАЖАННЯЎ У ПАЭЗІІ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

**Борбат Таццяна Іванаўна,**
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры літаратуры
і міжкультурных камунікацый
МДУ імя А.А. Куляшова
*(г. Магілёў)*

Аляксей Пысін належыць да таго пакалення беларускіх пісьменнікаў, што ў часы Вялікай Айчыннай вайны са зброяй у руках бараніла Бацькаўшчыну ад гітлераўскіх захопнікаў. У ваенныя гады А. Пысін, як і лірычны герой многіх яго вершаў, – на перадавой, сувязны, па-ваеннаму раскладу – «лінейны наглядчык».

Вайна прадвызначыла тэматычную і жанрава-стылёвую скіраванаць лірыкі паэта. У зборніках «Сіні ранак» (1959) і «Сонечная паводка» (1962) ужо пазначаны контуры дзвюх «сілавых ліній» у творчасці мастака (У. Калеснік, Р. Бярозкін), адна з якіх бярэ пачатак ад траншэй і акопаў мінулай вайны, другая – з бaрознаў на родным полі. У далейшым яны складуць сутнасць творчай асобы А. Пысіна («Удзячнасць», «Вузел», «Гвардзейскай дарогай», «Іван-чай», «Успомняцца – і адзавуцца...» і інш.).

Шматлікія творы, у якіх гучыць тэма памяці пра мінулую вайну, вылучаюцца верагоднасцю непрыдуманых сітуацый, дакладнасцю мастацкіх дэталяў, цікавымі асацыятыўна-вобразнымі знаходкамі («Была бранёю гімнасцёрка...», «Ляглі сябры ва ўсім паходным...», «Сны», «На ўзлессі дуб...»). Прытым канстатацыя падзей і фактаў, прадметна-рэчыўная канкрэтыка, суровасць рэалістычнага прамаўлення спалучаюцца з героіка-рамантычнай прыўзнятасцю настрою. І звычайнае, паўсядзённае набывае абрысы велічнага.Так, рака Проня, якую чужынцы прымушаюць скарыцца варожай сіле, застаецца непераможнай – бяздонныя крыніцы напаўняюць яе невычарпальнымі запасамі «жывой» вады: «... Ішлі мы паходам на захад тады, // І Проня дала нам напіцца вады. // Была яна светлай да самага дна, // І сонца, і неба адбіла яна» [«Проня», 6, с. 62].

Наступная кніга А. Пысіна – «Мае мерыдыяны» (1965), – пацвердзіць, што асноўнае, вызначальнае ў жыццёвым і духоўным вопыце паэта – вайна, у якой яму давялося ўдзельнічаць і пра якую ён шмат піша» [4, с. 15].

У 1960-я гг. паэзію А. Пысіна пачалі называць «ваеннай». Аднак такое азначэнне не зусім дакладнае, бо яно не адлюстроўвае ўсяго тэматычнага дыяпазону вершаў, якія маюць дачыненне да вайны. Сам паэт аб’ектам уласнай творчасці бачыў не толькі вайну, але і штосьці іншае: «Пішу пра смерць, пра кроў, // Пішу я пра сяброў, // А іх жа, родных, // Хавалі на вайне, // Хавалі не ў труне, // І запаветам мне: // “Пра нас раскажаш…”» [«Пішу я на сасне», 6, с. 313].

Кніга «Мае мерыдыяны» «звяжа ў адзін вузел паэтычны мерыдыян паэта, – слушна адзначыў В. Карамазаў, – з яго ваеннымі мерыдыянамі, звяжа настолькі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

моцна, што яны, гэтыя мерыдыяны, якраз і выведуць Пысіна на яго паэтаву вышыню» [5, с. 13].

Голас памяці – «пабрацімства мёртвых і жывых» – становіцца адной з мастацкіх дамінантаў сталай лірыкі паэта, тым «магнітным полем», якое прыцягвае і сінтэзуе ўсе думкі і пачуцці лірычнага героя.

А. Пысін з дакументальнай дакладнасцю ўзнаўляе трагічныя старонкі мінулых дзён. Памяць паэта захавала сапраўдныя геаграфічныя назвы, імёны, прозвішчы, падзеі, якія без зменаў увайшлі ў вершы («Вышыня капітана Гальпіна», «Далёкі тупат кананады», «Станцыя Гушчына», «Валуеў», «Балада пра камбата»). Душа былога франтавіка навякі прыкіпела да запаветных сопак і вышыняў, бліндажоў і зямлянак: «Пад ботам, пад сопкай вада, // Аж сосны ад вільгаці п'яныя. // І нас, пехацінцаў, вайна // Зрабіла амаль вадаплаўнымі // А сопак – як зорак вясной, // Па сопцы на кожнага выпала. // І кожны ішоў да сваёй, // Нёс сэрца сваё – замест вымпела» [«Калінінскія сопкі», 6, с. 101].

У шматлікіх вершах пра вайну заўважаецца спляценне падзей мінулых і сённяшняга дня. Пачуцці і думкі настолькі моцна сінтэзуюцца ў часе і прасторы, што аддзяліць частку ад цэлага амаль немагчыма («Палім мы маршанскую махорку...», «Станцыя Гушчына»). Так маналог лірычнага героя верша «Палім мы маршанскую махорку...» аднačасна звернуты да мінулага, сучаснага і будучага. У свядомасці былога воіна даўнія перажыванні пакінулі глыбокі след, і праз дваццаць гадоў помніцца ўсё да драбніц: як нервова перад боем палілі «маршанскую махорку», трывожна ўглядаліся ў «Дняпроўскую граду», спрабуючы адгадаць для сябе непазбежнае: «Палім мы маршанскую махорку, // Бачым мы Дняпроўскую граду. // Будзе сёння бой. На тым узгорку, // Можа, я таксама ўпаду» [6, с. 180].

У вершы «Палім мы маршанскую махорку...», як і ў многіх іншых, А. Пысін акцэнтуе ўвагу на тым, што чалавек у прадчуванні смерці моцны верай у тое, што яго не забудуць нашчадкі. Памяць абавязвае берагчы ад забыцця імёны загінуўшых сяброў, «злучыць біяграфічны вопыт з маральным, падтрымлівае пераемную сувязь людзей і пакаленняў» [2, с. 126].

Аднак мастацкая думка паэта скіравана «не проста на знешняе ўзнаўленне франтавых баталій, а на філасофскае асэнсаванне смертаноснай сутнасці вайны, калі нішчыцца чалавек і ўсё, што напаўняе навакольны свет. Смерць, франтавое «пабрацімства», памяць пра палеглых сяброў – гэтыя праблемы становяцца цэнтрам разважанняў А. Пысіна», – заўважае Т. Хоміч [7, с. 39].

Паэтычны свет Аляксея Пысіна – драматычны, напружаны. Творы паэта прасякнуты болем за баявых сяброў, што палеглі на франтавых шляхах: «На могілках, нашчадкамі забытых, – // І зелень дрэў, і чорныя сукі, // Паўзучы мох на адзінокіх плітах; // Тут у «вайну» гулялі хлапчукі. // Пасля баёў, усталяваўшы згоду, // Ламалі сучча, дыхалі ў касцёр» [6, с. 160].

Чаканне маці («Пяць патронаў у абойме»); чаканне салдатак-удоў («Аддавалі мы маткам бушлаты»), каска, што хруснула пад нагою касца («Зямля ўсё глыбей вайну хавае»), захаваныя памяццю сучасніка няўлоўныя рысачкі аблічча тых, хто не вярнуўся з вайны («Байцам спявае рэквіем сасоннік») – тыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шчымлівыя моманты, штрыхі і дэталі, з дапамогай якіх ствараецца «цэласна-псіхалагічная сістэма асэнсавання бытавога ліхалецця» [3, с. 44].

Драматызм ваеннага часу, франтавых умоў у кнізе А. Пысіна «Мае мерыдыяны» складае аснову лірычнага перажывання, з'яўляецца прычынай споведзі героя, аднак з праекцыяй на сучаснасць. «Можна зразумець, – зазначае П. Макаль, – чаму ў зборніку шмат вершаў прысвечана Вялікай Айчыннай вайне. Яна не толькі незабыўнай старонкай увайшла ў асабістую біяграфію паэта. Мінулае памагае яму ясней зразумець тыя пакутныя грамадзянскія пытанні, якія задае кожны наш сённяшні дзень. У гэтым сэнсе, як гэта ні дзіўна, вершы А. Пысіна пра вайну мне здаюцца найбольш сучаснымі ў яго кнізе» [1, с. 44].

У лепшых творах кнігі «Мае мерыдыяны» яшчэ выразней акрэсліліся тыя два кірункі паэтычных роздумаў, якія заўважаліся ў папярэдніх зборніках: зварот памяццю ў мінулае, погляд у сённяшні дзень, погляд як бы адтуль вачыма паўшых, тых, хто не дажыў да Перамогі. Як працяг размовы з імі гучыць унутраны маналог, у якім раскрываецца самае патаемнае, шчырае: «Яшчэ не скончана дарога // І хочаш думаць аб зямным. // Не пакідай мяне, трывога, // Будзь спадарожнікам маім» [«Яшчэ не скончана дарога», 6, с. 120].

Асэнсаванне паэтам франтавога вопыту перарастае ў цэласную, канцэптуальна паслядоўную і завершаную лірычную сістэму. Прытым А. Пысін паказвае вайну без прыхарошвання, ідылічнасці, не прымае фальшу і хлусні пра ваеннае мінулае: «Балада аб прывале», «Мы па латгальскай крочылі зямлі», «Бачыў свет у радасці і горы», «Бывай, самалёт! Ты вярнуў на зямлю», «Балада пра каску» і інш.

У адлюстраванні вайны, звароце да яе драматычных калізій літаратуразнаўцы бачаць падабенства паміж творчасцю А. Пысіна і В. Быкава. Для абодвух мастакоў слова характэрнае ўзнаўленне падзей і абставін ваеннага часу, асвятленне іх маральнага і духоўнага сэнсу. Аднак, калі В. Быкаў даследуе псіхалогію чалавека на вайне, яго паводзіны перад тварам смерці, то А. Пысін раскрывае ўнутраны свет былога франтавіка, які, вярнуўшыся да мірнага жыцця і працы, пастаянна занава перажывае і пераасэнсоўвае нядаўняе трагічнае мінулае («Абарваны трыпціх», «Байцам спявае рэквіем сасоннік», «Іван-чай»).

Так у вершы «Іван-чай» паэт згадвае эпізоды ваенных баталій на Смаленшчыне: «Тройчы адбівалі вёску Буду, // Тройчы паміралі за яе» [6, с. 127]. Пахаваныя там байцы – «Аляксеі, Віктары, Іваны», – набываюць рысы бессмяротнасці ў абагулена-рамантычнай вобразнай персаніфікацыі Іван-чаю.

Маленькая кветачка нагадвае аднаго са страчаных сяброў, становіцца суразмоўцам лірычнага героя. Адбываецца ўяўны дыялог былых франтавікоў, аднаму з якіх пашанцавала выжыць. Дыялог, поўны драматызму, адчування віны перад загінуўшымі: «Мы цыгарку скруцім па-быломý, // Пусцім шызы дым на правады. // Першая зацяжка – мне, жывому, // Бо занадта ў сэрцы гаркаты. // Чырвань, чырвань, колер праваты..» [6, с. 128]. Скупа, лаканічна, дакладна, узважваючы кожнае слова, распавядае аўтар аб гэтай сустрэчы сяброў-франтавікоў. Лаканізм, дакладнасць, афарыстычнасць становяцца вызначальнымі рысамі мастацкага стылю А. Пысіна.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Творы А. Пысіна ўсё больш прываблiваюць сваёй духоўнай актыўнасцю. У кнігах «Мае мерыдыяны» і «Твае далоні» (1967) асабліва выразна праступае маральна-філасофская канцэпцыя жыцця. Аўтар бачыць сваю задачу ў тым, каб злучыць мінулае і цяперашняе ў адзін тугі вузел.

Зборнік «Твае далоні» пачынаецца вершам «Сцяг», лірычны герой якога не проста наш сучаснік, горача адданы Радзіме, а былы салдат, які ўвесь час будзе адчуваць сябе байцом, «вартавым», што чакае ўсё змены: «Мой сцяг вышэй за ўсіх няўдач, // Вышэй усіх няпраўд. // Я сам загорнуты ў кумач // Ад галавы да пят. <…> Ты будзеш неўміручы, сцяг // Бо мы цябе нясем // Ў сваёй крыві, ў сваіх касцях // Перадаём – з жыццём» [6, с. 150].

Салдацкая клятва, якую дае паэт ад імя сваіх таварышаў па воінскай службе, выяўляе шчырасць і глыбіню пачуццяў, напоўнена драматызмам і непадкупным патрыятычным пафасам. Асаблівасць патрыятызму А. Пысіна – яго жыццёвая канкрэтнасць, «зямное прыцягненне», злітнасць з роднай зямлёй.

У паэзіі А. Пысіна часам з'яўляюцца вобразы інвалідаў вайны як увасабленне пакалення, што вынесла на сваіх плячах увесь цяжар яе, боль, фізічныя і маральныя пакуты. Гэта людзі, сціплыя, простыя, заўсёды шчодра даруюць людзям святло сваёй душы.

Голас памяці, які не дае супакоіцца, ветэраны вайны, сцяг, Радзіма – гэта толькі часцінкі цэласнага паэтавага светаўспрымання, яго філасофскага асэнсавання канцэпцыі часу і жыцця.

Адметнасць мастацкай спецыфікі ўвасаблення вобраза вайны не засланяе галоўнага ў паэтычнай канцэпцыі А. Пысіна: балючы ўспамін пра вайну і выразна ўзноўленыя рэальныя падзеі з'яўляюцца асновай для роздуму над спрадвечнымі праблемамі жыцця і смерці. Любая вайна – вострае адчуванне жыцця і штохвілiннае сутыкненне са смерцю. Вопыт А. Пысіна-франтавіка стаў падмуркам для філасофскага і мастацкага асэнсавання трагічных сутыкненняў жыцця і смерці на вайне.

Паэтычная тэма памяці нараджае новыя паэтычныя прыёмы, стылёвыя рысы (змешванне часоў, прысутнасць умоўнага і рэальнага, наяўнасць сноў). Усё гэта яшчэ больш абвастрае трагізм успрыняцця вайны. У большасці твораў, аб'яднаных тэмай памяці пра вайну, гучаць элегічныя матывы. Сум – гэта тое пачуццё, якім напоўнены амаль кожны верш А. Пысіна, ён як бы раствораны ў паэтычных радках.

Такім чынам, тэма памяці пра Вялікую Айчынную вайну становіцца вызначальнай у лірыцы А. Пысіна 1960–1970-х гг. Памяць для мастака – гэта і спроба знайсці сацыяльныя, маральныя каштоўнасці сённяшняга дня, спроба звязаць мінулае і сучаснае.

**Літаратура:**


1. Барадулін, Р. І. Слаўлю чысты абрус / Р. І. Барадулін. – Мінск : Беларусь, 1996. – 271 с.
2. Бечык, В. Л. Выбранае : літаратурна-крытычныя артыкулы / В. Л. Бечык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 478 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

3. Гарэлік, Л. М. Аляксей Пысін: нарыс жыцця і творчасці / Л. М. Гарэлік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 144 с.
4. Гніламёдаў, У. В. Ля аднаго вогнішча: літаратурна-крытычныя артыкулы / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Юнацтва, 1984. – 190 с.
5. Карамазаў, В. Трагедыі лірычны эпілог / В. Карамазаў // Пысін, А. Збор твораў : у 2 т. Т. 1. Вершы / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – С. 3–20.
6. Пысін, А. В. Збор твораў : у 2 т. Т. 1. Вершы / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 399 с.
7. Хоміч, Т. П. Мастацкая канцэпцыя чалавека і свету ў лірыцы А. Пысіна / Т. П. Хоміч. – Мінск : Беспрынт, 2009. – 128 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова